© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Чаму правяраюць чарнобыльскія фонды? (стар. 2)
Хроніка беларуска-расійскага дагавора аб саюзе (стар. 5)

СВАБОДА

Год заснавання 1902
Выходзіць з 1990
Галоўны рэдактар Ігар Гермянчук
Заснавальнік і выдавец Павел Жук
Наклад 37.090
Адрас рэдакцыі:
220088, Мінск, вул.Іванаўская, 56
Тэл./факс 2 362 441

Аўторак, 15 красавіка 1997 № 40 Кошт свабодны

Апазіцыя рыхтуецца да 26 красавіка

У Мінску створаны грамадскі камітэт па правядзенні «Чарнобыльскага шляху-97».

Як паведаміў на прэс-канферэнцыі яго старшыня Генадзь Грушавы, у склад аргкамітэта ўвайшлі лідэры БНФ, прадстаўнікі чарнобыльскіх фондаў і асацыяцый, навукоўцы, а таксама ўрачы з забруджаных раёнаў.

Прадстаўнікамі аргкамітэта ўжо пададзена ў Мінгарвыканкам заяўка на правядзенне ў суботу, 26 красавіка, шэсця ад Акадэміі навук (збор удзельнікаў у 15 гадзін) да пл.Незалежнасці, дзе з 17:00 да 18:30 плануецца правесці жалобны мітынг. Гарадскім уладам паступіла заяўка і ад аргкамітэта пры Вярхоўным Савеце 13-га склікання, які ўзначальвае прэзідэнт Саюза ліквідатараў «Шчыт Чарнобыля» дэпутат Савічаў. У гэтай заяўцы збор удзельнікаў таксама прызначаны на 15:00 каля Акадэміі навук. Шэсце мяркуецца правесці па праспекту Ф.Скарыны да скрыжавання з вул.Леніна і адтуль да Палаца спорту, дзе павінны адбыцца мітынг.

Па словах Г.Грушавога, ніякіх супярэчнасцяў паміж грамадскім камітэтам і аргкамітэтам пры ВС адносна месца правядзення мітынгу не існуе, проста вырашылі прапанаваць уладам два варыянты маршруту.

Генадзь Грушавы паведаміў, што на «Чарнобыльскі шлях» у якасці гасцей будуць запрошаныя дэпутаты парламентаў Францыі, Германіі, Польшчы, Літвы, Украіны і Расіі, а таксама назіральнікі ад АБСЕ, Еўрапарламента і замежныя журналісты.

Альгерд НЕВЯРОЎСКІ

«Шустры чалавек» з адміністрацыі апынуўся за кратамі

Былы супрацоўнік адміністрацыі прэзідэнта Анатоль Дромаў быў арыштаваны тыдзень таму. Яго абвінавачваюць у «злоўжыванні службовым становішчам».

Следчы мінскай гарадской пракуратуры Мікалай Шылаў, які вядзе справу Дромава, адмовіўся даваць якую-небудзь інфармацыю па факце затрымання Дромава, хаця і не абверг, што былы высокі чыноўнік прэзідэнцкай адміністрацыі сапраўды арыштаваны.

Анатолю Дромаву 45 гадоў. На пасаду намесніка начальніка эканамічнага ўпраўлення прэзідэнцкай адміністрацыі ён прыйшоў у лістападзе 1994 года з Кабінета міністраў, дзе ў кебічаўскія часы ўзначальваў эканамічнае ўпраўленне. Па словах Пятра Капітулы, які кіруе эканамічным ўпраўленнем адміністрацыі, ягоны падначалены быў даволі *«шустрым чалавекам з вялікімі сувязямі ў дзяржаўным апараце»*. У студзені 1996 г. Дромаў звольніўся па асабістым жаданні і далей, наколькі вядома, на дзяржаўнай службе не быў. Якія канкрэтна злоўжыванні інкрымінуюцца А.Дромаву — нам не ўдалося даведацца.

Алег ГРУЗДЗІЛОВІЧ

Пераможам?

Нават за кратамі дэманстранты не трацяць аптымізму.

(Здымак агенцтва Reuter).

Мінская міліцыя «раскручвае» некалькі крымінальных справаў супраць удзельнікаў акцый пратэсту.

У засценках следчай турмы на вул. Валадарскага ўжо трэці тыдзень трымаюць чатырох палітычных зняволеных. Гэта — 35-гадовы навуковы супрацоўнік БДУ Аляксандр Бондараў, 45-гадовы мастак Барысаўскага камбіната прыкладнога мастацтва Рыгор Кійко, 22-гадовы зваршчык мінскага метрабуда Аляксей Коваль, жыхар пасёлка Бярозаўка Лідскага раёна Аляксандр Цішук.

Паводле нашай інфармацыі, супраць А.Бондарава і Р.Кійко ўзбуджаны крымінальныя справы па артыкуле *«злоснае хуліганства»*, які прадугледжвае пакаранне пазбаўленнем волі да пяці гадоў. Абвінавачванні датычаць іхняга ўдзелу ў акцыі 23 сакавіка з нагоды гадавіны БНР. У пастанове следчага Данільчыка сцвярджаецца, нібыта *«Бондарев, выйдя с участниками шествия на проезжую часть проспекта, вел себя вызывающе, хватал сотрудников милиции и военнослужащих за форменную одежду, экипировку и специальные средства, препятствовал задержанию правонарушителей, провоцируя находящихся на улице граждан к злостному нарушению порядка. Он умышленно, из хулиганских побуждений, нанес не менее 2-х ударов кулаком по голове старшему прапорщику внутренних войск МВД РБ Карпеко М.И., пресекающему противоправные действия по нарушению общественного порядка, чем причинил потерпевшему побои»*.

Аналагічнае абвінавачванне інкрымінуецца тром іншым палітзняволеным.

Альгерд НЕВЯРОЎСКІ

Антановіча трымаюць у прыёмнай

Шэфу беларускага МЗС адмаўляюць у сустрэчах на высокім узроўні

У мінулы чацвер міністр замежных справаў Іван Антановіч зноў паехаў на Захад. Як паведаміла БелТА, ён меўся сустрэцца з кіраўніцтвам Еўрапейскага Саюза *«ў рамках дыялогу нашай краіны з гэтай міжнароднай арганізацыяй»*. Аднак Еўрасаюз трымае цвёрдую пазіцыю ў дачыненні да Беларусі.

У Гаазе І.Антановіч спадзяваўся мець сустрэчу з міністрам замежных справаў Каралеўства Нідэрланды Хансам ван Мерло, аднак у спатканні яму было адмоўлена. Не даў І.Антановічу аўдыенцыі і намеснік міністра. Шэфу беларускага МЗС удалося пагаварыць толькі з намеснікам сакратара галандскага знешнепалітычнага ведамства.

Як патлумачыў першы сакратар амбасады Нідэрландаў у Варшаве Каспар Вэльдкамп, Нідэрланды ад імя ўсіх 15 краінаў Еўрапейскага Саюза далі зразумець І.Антановічу, што *«наступ на свабоду прэсы, нядаўнія факты жорсткага абыходжання з дэманстрантамі і непавага да міжнародных прынцыпаў у галіне правоў чалавека толькі паглыбіць ізаляцыю беларускага ўрада на міжнароднай палітычнай сцэне»*.

Іван Антановіч пакрыўдзіўся...

10 красавіка ў горадзе Маастрыхт (Нідэрланды) адбылася сустрэча дыпламатаў высокага рангу, якія прадстаўлялі ўсе 15 краін Еўрасаюза. Абмяркоўвалася сітуацыя ў Беларусі.

Магдалена НЕПАКАЙ

Хто служыць у міліцыі

Выкладчыца прававых дысцыплін Гомельскага вучэбнага цэнтра міліцыі маёр Ірына Кучвальская правяла цікавае апытанне каля 200 супрацоўнікаў міліцыі.

Выявілася, што ў міліцыю ў большасці сваёй ідуць вясковыя хлопцы, якія не маюць ніякай спецыяльнай адукацыі, прафесіі і не могуць знайсці ў горадзе іншую працу. Напрыклад, сярод амонаўцаў такіх 55%. Каля 85% працэнтаў апытаных заявілі, што хацелі б павысіць свой адукацыйны ўзровень (сярэдні бал школьнага атэстата міліцыянтаў — тры з хвосцікам). На пытанне: што вы лічыце галоўнай мэтай сваёй дзейнасці — караць ці абараняць людзей і правапарадак, абсалютная большасць адказала «караць». Сярод амонаўцаў такіх 92%.

А вось як міліцыянты ацэньваюць свае магчымасці абараніць уласныя правы. 52% лічаць, што не могуць зрабіць гэта законным шляхам. Сярод амонаўцаў «бездапаможных» 82%.

Уладзімір СТАРЧАНКА

З'езд сацыял-дэмакратаў

Мікалай Статкевіч застаецца лідэрам Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі.

Так вырашыў з'езд БСДП, які прайшоў у мінулую суботу ў Мінску. У якасці гасцей на з'ездзе прысутнічалі сацыял-дэмакраты з Польшчы, Украіны, Расіі, Швецыі, Германіі і іншых краінаў.

Марына РАССАФОНАВА

Ад Грыба тэрмінова патрабуюць 20 мільёнаў

Дэпутат Вярхоўнага Савета Мечыслаў Грыб атрымаў з Партызанскага райсуда г. Мінска грозную паперу. Калі ён сёння не заплаціць 20 мільёнаў штрафу, то з яго могуць спагнаць яшчэ і 5% «няўстойкі».

У дакуменце выказваецца катэгарычнае патрабаванне, каб М.Грыб заплаціў штраф да 15 красавіка. Як вядома, 20 сакавіка Партызанскі суд Мінска прызнаў генерал-лейтэнанта міліцыі М.Грыба вінаватым у парушэнні прэзідэнцкага дэкрэта №5 падчас святкавання Дня Канстытуцыі 15 сакавіка. Суддзя Мікалай Трубнікаў, адхіліўшы ўсе хадайніцтвы Мечыслава Грыба, аштрафаваў яго на 20 мільёнаў рублёў. У сваю чаргу М.Грыб апратэставаў рашэнне Партызанскага райсуда ў Мінскім гарадскім судзе, пратэст прыняты да разгляду.

Тым часам у позве за подпісам судовага выканаўцы Урублеўскай сцвярджаецца, што ў выпадку няўплаты штрафу да 15 красавіка да М.Грыба *«будуць прынятыя меры для прымусовага выканання судовага рашэння»*, а звязаныя з гэтым выдаткі — 5% указанай сумы — *«будуць аднесеныя таксама на яго кошт»*.

БелаПАН

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

«Карал» памёр, віват «Вэсткар»!

Днямі зарэгістравана сумеснае беларуска-амерыканскае прадпрыемства «Вэсткар»

Так цяпер будзе называцца былы гомельскі завод па вытворчасці кінескопаў «Карал». Амерыканская кампанія «Вэстрэй» стала ўладальніцай 67% акцый прадпрыемства, астатнія 33% застаюцца ў беларускага ўрада.

Завод апошнім часам застаўся без спажыўцоў, бо кінескопы «Карала» безнадзейна састарэлі. Амерыканская фірма, каб мадэрнізаваць вытворчасць, збіраецца інвеставаць 24 млн. долараў у выглядзе новага абсталявання і «ноў-хаў». Плануецца, што за тры гады сумеснае прадпрыемства дасягне магутнасці 3–3,5 млн. кінескопаў у год. На пачатковым этапе прадугледжваецца пастаўка 80% выпускаемых кінескопаў за мяжу, і толькі 20% — на ўнутраны рынак. Мяркуецца, што гэтага хопіць для нармальнай работы беларускіх тэлевізійных заводаў. Першыя 500–600 тысяч кінескопаў будуць выпушчаныя ўжо сёлета. Уся дзейнасць сумеснага прадпрыемства будзе падпарадкаваная асноўнаму прынцыпу кампаніі «Вэстрэй»: спачатку якасць, затым колькасць. Дарэчы, увесь штат прадпрыемства — ад дырэктара да вахцёра — будзе працаваць на кантрактнай аснове. Амерыканскі бок узяў на сябе абавязак трымаць на працягу трох гадоў не менш 75% працаўнікоў «Карала» з першапачатковай зарплатай каля 200 долараў ЗША.

У.В.

Здаць пячаткі!

Дзяржаўны падатковы камітэт РБ паведаміў, што з 15 красавіка 1997 г. прыпыняецца рух сродкаў па рахунках, а таксама дзейнасць суб'ектаў гаспадарання, якія не выканалі ўказ прэзідэнта № 208 ад 24 траўня 1996 г. «Аб некаторых мерах па ўпарадкаванні дзейнасці суб'ектаў гаспадарання».

Як вядома, гэтым указам была ўведзеная абавязковая перарэгістрацыя прадпрымальнікаў і юрыдычных асоб. Цяпер жа тыя з іх, хто не прайшоў перарэгістрацыю, абавязаны неадкладна здаць пячаткі і штампы ў органы ўнутраных справаў па месцы знаходжання. Прынятае падатковым камітэтам рашэнне практычна азначае ліквідацыю даволі вялікай колькасці фірмаў.

Б.П.

Ярмошын на Святой зямлі

На мінулым тыдні мэр Мінска Уладзімір Ярмошын выехаў у Ізраіль, каб узяць удзел у міжнароднай канферэнцыі.

Месцам правядзення канферэнцыі «Ад мінулага да будучыні: муніцыпалітэт як рухавік развіцця» быў абраны Іерусалім, запрошаныя кіраўнікі гарадскіх адміністрацый многіх сталіцаў свету. Такія форумы мэраў праводзяцца з 1980 года. Як паведамілі ў аддзеле замежных сувязяў Мінгарвыканкама, У.Ярмошын паехаў у Ізраіль з цвёрдым намерам сустрэцца і правесці перамовы з мэрамі шэрагу сталіц, пазнаёміцца з вопытам муніцыпальнай працы ў іншых краінах. Будзем спадзявацца, што жыццё ў Мінску пасля гэтага стане больш цывілізаваным.

БелаПАН

Польскія прафсаюзы пратэстуюць

Каля 30 рэгіянальных камітэтаў буйнейшага польскага прафсаюза *Solidarność* накіравалі лісты пратэсту старшыні Магілёўскага аблвыканкама Аляксандру Кулічкову.

Кіраўнік беластоцкага рэгіянальнага камітэта *Solidarności* Юзэф Мазалеўскі ўручыў петыцыю пратэсту беларускаму консулу. Такім чынам польскі прафсаюз дэманструе сваю падтрымку Магілёўскай абласной арганізацы Свабоднага прафсаюза Беларусі. Магілёўскія прафсаюзныя актывісты вымушаныя былі некалькі разоў пікетаваць будынак аблвыканкама, бо ўлады ўпарта адмаўляюцца прызнаваць СПБ і весці з ім перамовы.

Сымон ГЛАЗШТЭЙН

Жабрацкае жыццё

85% насельніцтва Гродзенскай вобласці мае даходы ніжэй за кошт мінімальнага спажывецкага кошыка.

Пра гэта паведаміў журналістам начальнік абласнога ўпраўлення статыстыкі Віталь Бобрык. У лютым кошт гэтага кошыка на Гродзеншчыне быў роўны 1 млн. 68 тысячам рублёў на чалавека. Па словах В.Бобрыка, у спажывецкім кошыку ўлічваюцца мінімальныя грошы на харчаванне, а таксама выдаткі на адзенне (напрыклад 4 пары шкарпэтак з разліку на год), абутак, транспарт, на тэатр і г.д. Такім чынам, толькі 15% жыхароў вобласці маюць у месяц у разліку на адну асобу 1 млн. 68 тыс. рублёў і болей.

Што датычыць наогул статыстыкі, дык, па словах В.Бобрыка, асноўная праблема ў тым, што частка арганізацый дае справаздачныя дакументы з апіскамі і памылкамі, а спазненні з падачай звестак сталі ўвогуле *«нормай і хранічнай хваробай»*. Сама статыстычная служба, у якой па вобласці працуе 475 чалавек, галоўнай сваёй праблемай лічыць старую камп'ютэрную тэхніку яшчэ савецкай вытворчасці. У некаторых райцэнтрах яна зламалася, і падлікі даводзіцца рабіць на паперы.

Сяргей АСТРАЎЦОЎ

Рэферэндум прайшоў, а толку няма

Падчас апытання грамадскай думкі, праведзенага на мінулым тыдні, сацыялагічная служба «Зеркало» прапанавала мінчанам адказаць, ці апраўдаліся іхнія спадзяванні на паляпшэнне жыцця пасля апошняга рэферэндуму.

39% рэспандэнтаў прызналіся, што ніякіх спадзяванняў яны і не мелі. Практычна столькі ж апытаных (38%) лічаць, што іхнія спадзяванні не апраўдаліся. Толькі 2% рэспандэнтаў заўважылі нейкае павышэнне жыццёвага ўзроўню пасля рэферэндуму. 12% апытаных адзначылі, што змены адбыліся неадназначныя: адныя сталі жыць лепш, а іншыя — яшчэ горш, чым жылі да лістапада 1996 г.

БелаПАН

Што пішуць пра нас у Швецыі

Падчас семінара па сучаснай журналістыцы, які ў мінулую суботу праводзіўся ў Мінску і на якім шведскія журналісты дзяліліся вопытам сваёй работы, зайшла гаворка пра тое, як адлюстроўваецца Беларусь у шведскіх СМІ.

Як расказалі карэспандэнтка шведскага радыё І.Макрыдава і журналіст-газетчык К.Тхор, шведская прэса, на жаль, практычна не падае інфармацыі пра жыццё людзей у Беларусі, пра беларускую культуру і г.д.; матэрыялы пра Беларусь — выключна палітычныя, і амаль што адзіны персанаж у іх — Лукашэнка. Ходкім штампам стала характарыстыка Лукашэнкі, якая пастаянна суправаджае ягоныя прозвішча ў шведскім друку, — «увасабленне цёмных сілаў». Шведскім чытачам увесь час нагадваюць, што Лукашэнка — апошні дыктатар у Еўропе, што ў Беларусі няма парламента, а свабода слова жорстка абмяжоўваецца. Прычым гэткія ацэнкі палітычнаму рэжыму і асобіста Лукашэнку шведскія СМІ даюць незалежна ад сваёй палітычнай афарбоўкі — і левыя, і правыя з'яўляюцца адзінымі ў непрыманні дыктатуры.

Клаас Тхор зазначыў, што інфармацыя пра падзеі ў Беларусі падаецца вельмі аператыўна. *«Калі ў Мінску паліцыя разганяе дэманстрацыю, — сказаў ён, — мы ўвечары ўжо бачым гэта па тэлевізіі, а зранку наступнага дня не толькі ў цэнтральных, але і ў мясцовых газетах можна прачытаць журналісцкія каментары да падзеі, меркаванні на гэты конт як беларусаў, так і шведаў».*

Вадзім КАЗНАЧЭЕЎ

«Чалавекам года» ў Амерыцы можа стаць беларускі акадэмік

Міжнародны савет Амерыканскага біяграфічнага інстытута вылучыў беларускага акадэміка Мікалая Барысевіча на намінацыю «Чалавек года — 1997».

У лісце, падпісаным галоўным выканаўчым дырэктарам інстытута Дж.Івенсам, паведамляецца, што кандыдатура М.Барысевіча была адабраная са спісу шматлікіх выдатных людзей і што выбар быў *«сапраўды нялпростай задачай»*.

Біяграфічная даведка. Акадэмік, былы прэзідэнт Акадэміі навук Беларусі Мікалай Аляксандравіч Барысевіч нарадзіўся ў 1923 годзе ў пасёлку Лучны Мост Мінскай вобласці. Закончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт у 1950 годзе. Доктар фізіка-матэматычных навук. Аўтар шматлікіх навуковых прац у галіне люмінесцэнцыі і спектраскапіі складаных малекулаў. Лаўрэат Ленінскай прэміі (1980) і Дзяржаўнай прэміі СССР (1973). Сааўтар навуковага адкрыцця — з'явы стабілізацыі-лабілізацыі ў мнагаатамных газах.

БелаПАН

Чаму правяраюць чарнобыльскія фонды?

Праверка дабрачынных чарнобыльскіх фондаў, якая ажыццяўляецца па распараджэнні Савета бяспекі, праводзіцца не з фінансавымі, а з палітычнымі мэтамі.

Пра гэта заявіў на прэс-канферэнцыі прэзідэнт дабрачыннага фонду «Дзецям Чарнобыля» Генадзь Грушавы. Ён назваў некалькі прычынаў, якія, на ягоную думку, падштурхнулі ўлады распачаць наступ на незалежныя дабрачынныя фонды. Першая прычына — гэта тое, што незалежныя фонды змаглі стварыць паралельную дзяржаўнай сістэму сацыяльнай падтрымкі, якая ахоплівае дзесяткі тысяч чалавек. Другая прычына — магчымасць для соцень тысяч людзей незалежна ад кантролю дзяржавы мець гуманітарныя сувязі і кантакты з грамадзянамі іншых краінаў свету, а гэта — незалежны інфармацыйны канал. Трэцяй прычынай Грушавы лічыць тое, што *«палітыка беларускіх уладаў арыентаваная толькі на Усход, а да Захаду мы павярнуліся спіной»*.

Адной з заслугаў дабрачынных чарнобыльскіх фондаў Грушавы лічыць тое, што яны шмат у чым адкрылі краінам Захаду і ўсяму свету Беларусь. *«Сёння, — сказаў Грушавы, — больш чым сто тысяч дзяцей пабывалі за мяжой толькі праз фонд «Дзецям Чарнобыля», а калі ўлічыць дзейнасць усіх грамадскіх арганізацый чарнобыльскай накіраванасці, то гэтая колькасць складзе каля двух сот тысяч. Усяго каля мільёна грамадзян Беларусі так альбо інакш ахоплена дзейнасцю дабрачынных фондаў».* Па словах Грушавога, удар па незалежных фондах сведчыць аб тым, што ў беларускай дзяржаве развіваюцца таталітарныя тэндэнцыі. Праверка дабрачынных фондаў, ініцыяваная Саветам бяспекі, выклікала здзіўленне і абурэнне многіх арганізацый усяго свету, якія ўспрынялі гэта як наступ беларускіх уладаў на дэмакратыю. У прыватнасці, у заяве Міжнароднага бюро міру адзначаецца, што калі *«бессаромныя дзеянні»* беларускіх уладаў не будуць неадкладна спыненыя, то гэта *«можа незваротна падарваць аўтарытэт беларускай дзяржавы ў свеце»*.

БелаПАН

Амерыканскія фермеры гатовыя дапамагчы нашым

У Мінску па запрашэнні беларускай філіі амерыканскай арганізацыі *VOCA* — «Добраахвотнай асацыяцыі дапамогі фермерам» — знаходзіцца Стывенс Плаўмен, прэзідэнт Банка фермераў і гандляроў *BFM* (г.Ганібал, штат Місуры, ЗША).

Ён кансультуе супрацоўнікаў «ДжэмБанка» і кампаніі «ДжэмКомерс», клііентамі якіх з'яўляюцца беларускія фермерскія гаспадаркі. Сп. Плаўмен паведаміў, што галоўная задача асацыяцыі *VOCA* і яе праграмы «Фермер для фермера» — тэхнічная дапамога фермерству, якое яшчэ толькі зараджаецца ў розных краінах свету, у тым ліку і ў Беларусі. Пры гэтым амерыканскі банкір заўважыў, што, перадаючы новыя тэхналогіі банкаўскай дзейнасці, *BFM* будзе аказваць беларускім фермерам і неабходную кансультатыўную дапамогу. Па словах прэзідэнта *BFM*, у Беларусі цяпер знаходзіцца адзін такі спецыяліст — фермер з Амерыкі, які кансультуе садаводаў. На думку амерыканскага банкіра, «ДжэмБанк» і кампанія «ДжэмКомерс» тэхнічна і прафесійна гатовыя для фінансавай падтрымкі фермерскай дзейнасці ў Беларусі.

БелаПАН

Трое наперад, адзін – назад

Польшча — Літва — Беларусь — Расія

Чатыры краіны вырашылі стварыць эканамічны еўрарэгіён «Нёман», праект якога можа застацца толькі на паперы – з-за палітыкі беларускіх уладаў.

У Гродне адбылася міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная прававым аспектам памежнага супрацоўніцтва паміж Беларуссю, Польшчай, Літвой і расійскай Калінінградскай вобласцю. Яе арганізатары — Цэнтральна- і Усходнееўрапейская прававая ініцыятыва *(CEELI)*, Амерыканская асацыяцыя юрыстаў *(ABA)* і Гродзенскі дзяржаўны універсітэт.

Амерыканскі пункт гледжання

Першай была прамова Эмі Стэмпс — другога сакратара амерыканскай амбасады ў Беларусі. Ёю была публічна выкладзена сённяшняя афіцыйная пазіцыя Злучаных Штатаў адносна Беларусі. Эмі Стэмпс зазначыла, што ў свеце шырока развіваецца памежнае супрацоўніцтва. Суседнім дзяржавам гэта дапамагае эфектыўна змагацца з кантрабандай, нелегальнай міграцыяй, а таксама са злачыннымі групоўкамі. Але ёсць і іншыя выгоды. Гэта — паляпшэнне эканамічнай сітуацыі ў памежных рэгіёнах, а таксама рух да дэмакратыі, якім суправаджаецца эканамічны росквіт. Бо, як паказвае сусветны досвед, без дэмакратычных пераўтварэнняў сапраўдныя эканамічныя рэформы па-сутнасці немагчымыя.

Што датычыць канкрэтна еўрарэгіёна «Нёман», у якім плануецца ўдзел Сувалкскага ваяводства Польшчы, Калінінградскай вобласці Расіі, двух уездаў Літвы і Гродзенскай вобласці Беларусі, дык, па словах Э.Стэмпс, тры з гэтых краін сёння рухаюцца па шляху рынкавай эканомікі і дэмакратыі. Аднак чацвёртая выўляе цяге да каманднай эканомікі і аўтарытарызму. Ці можа такая краіна, якая адмаўляе агульнапрызнаныя каштоўнасці, быць надзейным партнёрам у памежным супрацоўніцтве? Пытанне рытарычнае.

Стрыманы аптымізм астатніх

Памочнік губернатара Калінінградскай вобласці па міжнародных пытаннях Канстанцін Агаркаў расказаў аб стварэнай у іх асобай эканамічнай зоне «Янтарь». Каб прыцягнуць замежны капітал, гаворыць ён, мала спрабаваць «прыцягнуць», заманьваць бізнесменаў з працягнутай рукой. Трэба папросту рэальна стварыць прывабныя ўмовы для інвестараў і яны самі прыйдуць, іх не трэба будзе нават клікаць. У Калінінградскай вобласці гэта ў рэшце рэшт зрабіць здолелі.

Нашы беларускія ўлады сумуюць у непаразуменні: куды айчынныя дзелавыя людзі дзяваюць свае долары, чаму не ўкладваюць у эканоміку «рэспублікі»? А вось, аказваецца, грошы перацякаюць у Калінінградскую вобласць. Па словах сп.Агаркава, беларусы, маючы там нязначную колькасць сумесных прадпрыемстваў (усяго 30), па статутным капітале займаюць першае месца сярод астатніх замежнікаў. Для параўнання: літоўцы заснавалі ў вобласці 210 сумесных прадпрыемстваў, а палякі нават 385. Агулам у зоне «Янтарь» працуе капітал з 50 краін. Гавораць пра тое, што Калінінградскі рэгіён апошнім часам моцна адчувае сваю адасобленасць ад метраполіі, сп.Агаркаў выказаў задаваленне тым, што сёння адлеглясць зменшылася, бо Беларусь і Расія цяпер «адна краіна».

Дацэнт Калінінградскага універсітэта Г.Крэцінін тэарэтычна падмацаваў апошнюю думку. Даліна Нёмана, вакол якой плануецца адзінаймены еўрарэгіён, заўсёды была гандлёвай артэрыяй. Аднак менавіта тут пройдзе будучая палітычная мяжа. Маўляў, Літва з Польшчай далучацца да Еўрасаюза і *NATO*, а Беларусь — да Расіі. Фармаванне адзінай супольнасці еўрарэгіёна мае, на яго думку, яшчэ адну складанасць. Польшча і Літва — гэта каталіцкія краіны, а Калінінградская вобласць і Беларусь — праваслаўныя. Сп.Крэцінін толькі не ўлічыў, што ў «Нёман» увойдзе не ўся РБ, а толькі яе Гродзенская вобласць, якую ніяк не назавеш праваслаўнай.

Стрыманы аптымізм адносна будучыні выказаў і Тадэвуш Асеняк, дырэктар бюро еўрарэгіёна «Нёман», якое месціцца ў г.Сувалкі (Польшча). Ён спадзяецца, што шчыльнае супрацоўніцтва дазволіць чатыром суседнім краінам палепшыць эканамічныя справы і дабрабыт, паспрыяе залагоджанню гістарычных крыўдаў і непаразуменняў, а таксама — пашырэнню дэмакратыі. Праўда, адчуўшы адыёзнасць моманту (адносна стану дэмакратыі ў Беларусі), ён тут жа дадаў, што супрацоўніцтва ў рамках «Нёмана» не можа закранаць унутраныя справы кожнай з краін...

«Асобнае меркаванне»

Скептычным было выступленне С.Домаша, які ў свой час, калі быў кіраўніком вобласці, меў дачыненне да пачаткаў цяперашняга праекта «Нёман». Ён нагадаў, што найбліжэй да цеснага супрацоўніцтва мы былі ў 1993-94 гг., калі Беларусь ставілася да Польшчы і Літвы па-сяброўску. Сёння беларускія ўлады ставяцца да гэтых краін з падазронасцю, пры якой рэальнага супрацоўніцтва хутчэй за ўсё не атрымаецца. А значыцца, на Гродзеншчыне не палепшыцца становішча прадпрыемстваў, жыццёвы ўзровень насельніцтва, а таксама не пабольшае дэмакратыі.

Сяргей АСТРАЎЦОЎ

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Не надо врать, господа!

Открытое письмо Семена Шарецкого В.Черномырдину, Е.Строеву, Г.Селезневу

Уважаемый Виктор Степанович!
Уважаемый Егор Семенович!
Уважаемый Геннадий Николаевич!

Написать вам письмо меня вынудила та наглая ложь и клевета на законно избранных моих коллег по Верховному Совету Республики Беларусь, а вместе с ними и на многих других видных общественных и политических деятелей страны, которая ежедневно льется с телевизионных экранов и слышится по радио, а также беспардонное вмешательство некоторых политических деятелей Российской Федерации в дела суверенной Беларуси, народ которой и его многовековую историю они «знают» лишь благодаря тому, что здесь служили в армии или потому, что в здешних местах родились их близкие, а то и дальние родственники.

Вы, уважаемые господа, знаете, что всеми европейскими структурами единственно легитимным законодательным органом на территории Беларуси признан законно избранный народом (а не подобранный президентом по принципу личной преданности или путем запугивания лишить «куска хлеба») Верховный Совет.

Грубейшие нарушения законности во время подготовки и проведения референдума, которые были умышленно совершены А.Лукашенко и его окружением с целью достижения желаемых результатов, не ставят под сомнение легитимность Верховного Совета. Перечень этих нарушений есть и у вас, но поскольку вы делаете вид, что ничего страшного не случилось, я напоминаю их еще раз:

во-первых, монополизация А.Лукашенко и его окружением всех государственных средств массовой информации. Вы, господин Селезнев, Ваш товарищ по партии господин Зюганов и все его коллеги имеете возможность высказать свое мнение (в том числе и обвинения в адрес своего президента, хотя они порой бывают не совсем обоснованными) по всем трем каналам телевидения. Я же не мог тогда, а тем более сейчас, воспользоваться белорусским телевидением хотя бы для того, чтобы поздравить своих соотечественников с государственными праздниками, не говоря уже о чем-то другом;

во-вторых, во время референдума до «вертикальщиков» был заранее доведен процент голосования, невыполнение которого грозило им потерей работы, что в условиях «казарменного социализма», существующего в Беларуси, равносильно потере средств к существованию;

в-третьих, финансирование, печатание и доставка бюллетеней осуществлялась минуя Центральную и местные избирательные комиссии;

в-четвертых, голосование шло две недели, в течение которых президент и его команда не прекращали агитацию, причем голосование проводили в основном на дому, прибегая при этом для доставки бюллетеней даже к услугам почтальонов;

в-пятых, эти и другие массовые нарушения в ходе голосования, засвидетельствованные соответствующими актами, я передал Генеральному прокурору, на что так и не получил ответа;

в-шестых, отстранение указом президента (!) назначенного Верховным Советом, как того и требует Конституция, председателя Центризбиркома и блокирование последнего (начиная с 15 и заканчивая 24 ноября) вооруженной охраной президента, что лишило на протяжении всех этих дней доступа в здание Центральной избирательной комиссии общественности и представителей прессы, создало благоприятные условия для фальсификации итогов выборов, без чего никакой «победы» на референдуме А.Лукашенко достичь никогда бы не смог.

И седьмым по счету, но не по весомости, доказательством незаконности ноябрьского референдума является то, что люди голосовали бюллетенями, на которых была сделана пометка, что отдельные вопросы, выносимые на референдум, в том числе и вопрос, касающийся Конституции, носят консультативный характер. Обязательным же этот вопрос сделал своим указом А.Лукашенко.

Все это и дает право квалифицировать так называемый референдум как государственный переворот, совершенный А.Лукашенко и его окружением с целью захвата неограниченной власти. У того, кто внимательно ознакомился с «лукашенковской» конституцией, нет никаких сомнений, что ни о какой демократии и законности в Беларуси не может быть и речи, если законодательная и судебная власти сведены этой конституцией до «карманных».

Что же касается подписанного в ту памятную ночь соглашения, то сам А.Лукашенко и его приближенный В.Коноплев призвали депутатов не голосовать за него (соглашение, в котором, как вы помните, референдум определялся также как консультативный). Так что голосование в Верховном Совете провалили не честные и порядочные депутаты, которые поверили вам — представителям России, а те, кто стремился оказать «услугу» президенту, за что они и получили затем теплые места в «палате представителей». Поэтому при ответе на вопрос, заданный вам в Минске депутатом Щукиным, который, кстати, 2 апреля был жестоко избит милицией и госпитализирован, Вы, господин Селезнев, просто обманывали своего товарища по партии так, как в свое время лгал и ваш товарищ по Госдуме и по партии В.Илюхин, говоря, что в Польше разместились разведывательные центры США и ведут подрывную деятельность против А.Лукашенко, как и врет в настоящее время Ю.Лужков, говоря о том, что в Беларуси нет оппозиции А.Лукашенко, а есть пятая колонна других государств.

Как и в свое время завравшийся В.Жириновский утверждал, что мне присылают миллионами американские доллары, так и Вы, господин Селезнев, сейчас кощунствуете, когда безо всяких на то оснований заверяете телезрителей в том, что участникам митингов в Беларуси кто-то платит по пять долларов, и что я и первый секретарь ЦК ПКБ, член Президиума Верховного Совета Республики Беларусь С.Калякин шли в колоннах демонстрантов вместе с С.Шушкевичем, протестуя против интеграции с Россией — якобы из-за того, что мы оказались «не у дел».

Во-первых, С.Калякин никогда ни в одной демонстрации не участвовал вместе с С.Шушкевичем. Во-вторых, С.Шушкевич, как и я, никогда не выступал и не выступает против интеграции с Россией. И я, и С.Калякин, и все депутаты Верховного Совета Республики Беларусь при деле, и занимаемся им настолько эффективно, что вы не находите никаких иных «аргументов», кроме повторения махровой лжи. Вы не унижаете нас этим, а унижаете себя.

Поддерживая А.Лукашенко, господа, вы поддерживаете лжеца и лицемера, которому для удовлетворения своих диктаторских амбиций недостаточно небольшой по территории и численности населения Беларуси. Ему нужна великая Россия, как в свое время его кумиру — австрийцу А.Гитлеру — понадобилась великая Германия.

Так что я, С.Калякин и многие другие депутаты, оставшиеся верными Конституции 1994 года, выступаем не против подлинной интеграции, начинающейся с создания единого информационного пространства и экономической интеграции, а против ее подмены А.Лукашенко политиканством во имя удовлетворения своих личных властолюбивых амбиций. И сегодня против этого протестуют уже не 12 тысяч (как Вам, господин Селезнев, этого хочется), а сотни тысяч граждан Беларуси. Просто пока что не все в условиях страшных репрессий могут открыто выразить свое мнение.

Минск, после его оккупации фашистами, не видел такого количества вооруженных людей и таких массовых и жестоких избиений народа, какие сейчас наблюдаются на его улицах.

Уважаемые господа! Не уподобляйтесь таким деятелям, как Муравьев, который за его жестокость при подавлении свободолюбия и стремления белорусов «людьми зваться», вошел в историю Беларуси как вешатель. Не уподобляйтесь таким, как К.Гей, присланный Сталиным в начале 1930 года на должность секретаря ЦК КП(б)Б и устроивший массовые репрессии над учеными и творческими работниками республики, оклеветавший в том числе и гордость белорусской литературы — Янку Купалу, чего народный поэт Беларуси не выдержал и совершил попытку самоубийства. Не поддерживайте тех, кто травил и продолжает травить совесть белорусского народа, всемирно известного писателя Василя Быкова!

Да, мы, граждане Республики Беларусь, не хотим жить во вселенской «коммуналке», которую Вы собираетесь создать, организуя опять какие-то союзы. Мы хотим жить в своем доме — суверенном государстве, разговаривать каждый в зависимости от национальности и желания на своем родном языке, а не пользоваться «белорусским» для того, чтобы кого-то передразнить, как это делает господин Лукашенко, мы хотим изучать и знать культуру и историю своего народа.

Вместе с тем мы выступали и выступаем за интеграцию с Российской Федерацией. В то же время мы хотим, чтобы связи Беларуси с Россией не противопоставлялись нашим добрым отношениям с другими государствами.

Мы стоим за взаимоуважительные, взаимовыгодные и равноправные отношения между нашими странами.

Мы категорически осуждаем визиты в Минск таких деятелей, как К.Затулин, С.Бабурин и А.Тулеев, которые высказываются о нашем государстве как о своей вотчине, «назначая» при этом А.Лукашенко президентом какого-то нового государства.

Мы, белорусы, уважаем и ценим братский русский народ. Поэтому я считаю себя обязанным предупредить через обращение к вам:

Уважаемые россияне! Не повторите наших ошибок, допущенных при избрании президентом А.Лукашенко! Не верьте его словам и лживым обещаниям! Не идите у него на поводу, ибо это обернется трагедией и для народов России, и для народа Беларуси!

С.ШАРЕЦКИЙ,
г.Минск, 9 апреля 1997 г.

РЕЗОНАНС

Лукашенко утверждает: в руководстве России есть предатели

9 апреля, выступая перед партхозактивом Брестской области, Александр Лукашенко позволил себе одно из самых скандальных высказываний, которые он когда-либо допускал в адрес российских властей. В руководстве России, по мнению Лукашенко, достаточно людей, настроенных против любого сближения с Беларусью. *«Эти люди, — заявил далее президент, — четко выполняют заказ своих заокеанских хозяев».*

Мысль выражена предельно четко. Произнеся эту фразу перед телекамерами, Александр Григорьевич лишил себя возможности утверждать, как это не раз бывало в прошлом, что его неправильно поняли. В лицо России брошено страшное обвинение: в ее правительстве есть предатели, работающие на Соединенные Штаты.

Идея эта не нова. Ее нередко приходилось слышать из уст представителей оппозиции. Кремль, как правило, пропускал подобные выпады мимо ушей. Но вправе ли он поступить так сейчас, когда прямое оскорбление в адрес Бориса Ельцина и Виктора Черномырдина (которые формировали правительство и, следовательно, пригласили участвовать в нем предателей) позволил себе не безвестный депутат с красным значком на лацкане пиджака, а президент другого государства?

Лукашенко никак не может набраться терпения. Казалось бы, что ему стоило подождать еще месяц, пока продолжается «всенародное обсуждение» договора о союзе, не вмешиваться столь бесцеремонно в российские внутриполитические дела, не бросать публично вызов Кремлю? Но бывший директор совхоза, видимо, не в силах совладать с эмоциями. К тому же Лукашенко привык: его вызывающие шаги в Москве предпочитают не замечать. Повторится ли история на сей раз?

А вообще-то белорусского президента следует поблагодарить. Откровенность, в конце концов, не такое уж плохое качество. Если у Ельцина еще оставались хоть малейшие сомнения, чью сторону займет Лукашенко, пробившись на российскую политическую сцену, то после 9 апреля они должны окончательно отпасть.

Максим ЮСИН
Известия, 11 апреля 1997 г.

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

«Мы не хотим воевать против собственного народа»

Главному редактору газеты СВАБОДА от группы работников милиции

Просим опубликовать в вашей газете нашу точку зрения на происходящие события.

Недавние столкновения на улицах Минска, в результате которых появляется все больше и больше крови, не могут оставить нас равнодушными. Вопреки устоявшемуся мнению, что мы, работники милиции, это бездушные и жестокие существа, которые способны только избивать беззащитных граждан, хотим заявить следующее. Мы четко осознаем, что втягивание нас в кровавые политические игрища происходит по вине нынешнего руководства Республики Беларусь, которое должно нести за это ответственность. В учебных заведениях МВД нас учили бороться с преступностью и охранять общественный порядок, но в последнее время нас заставляют заниматься совсем другим. Можно предположить, что общественный порядок нарушает группа лиц численностью 50—100—200 человек, но когда нас выставляют против тысяч и тысяч граждан, то это уже не обеспечение общественного порядка, а гражданская война против собственного народа. Мы не желаем браться за кровь с разработчиками авантюрных и преступных идей, которые все сильнее ведут к обострению отношений между милицией и народом, ведут к бойне.

Некоторые из наших товарищей сегодня находятся в медицинских учреждениях и задают себе вопрос: за что я получил травму и кому это выгодно? Все больше работников милиции понимают, что их стрессы и увечья — это результат выполнения преступных приказов, которые исходят известно от кого. Если наши старшие начальники боятся ослушаться чьих-то указаний «сверху», то мы сделаем это сами. Среди нас есть люди, прошедшие Афганистан, Нагорный Карабах, Вильнюс и Чернобыль, поэтому страхом и принуждением нас не возьмешь. Если наши трусливые генералы и полковники дрожат за высоту и материальные блага, то нам, по 10–15 лет не имеющим даже своего угла, терять нечего. Многие работники милиции начали подавать рапорты об увольнении из органов внутренних дел, и это их ошибка. Почему мы должны жертвовать карьерами ради глупости, трусости и самодурства высоких начальников? Пусть лучше они подают такие рапорты, а мы будем бороться за свои права.

Это не мнение какой-то группы «заговорщиков», а мнение многих и многих милиционеров. Мы это знаем, потому что часто встречаемся и обмениваемся информацией. Предупреждаем: не втягивайте нас в политические игры и кровь! И предупреждаем тех, кто наиболее «старается» резиновыми палками на митингах: мы вас видим и знаем! И запомним...

По известным причинам фамилии не указываем

Стэлаж гандлёвы

Вытворчасць гандлёвых і складскіх стэлажоў па індывідуальных заказах

Тэл. (017) 236-24-41

СЭ - П
195 × 70

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Режим переходного периода

Тоталитарные сумерки

Вячеслав ОРГИШ
доктор философских наук

Слово «массы» обманчиво. Часто, в целях политической спекуляции, оно трактуется как синоним слов «народ», «человечество». Однако массы не способны вместить в себя всю ту сущность, которая присутствует в человеке как индивидуальном носителе народной души и истинного человеческого состояния. В своем непосредственном виде, как некое безымянное тождество, массы могут стать объектом очень опасной политической манипуляции, результатом которой оказывается погружение общества в средневековое варварство.

Массы как орудие диктатуры

Третий признак тоталитарной власти — существование широкого общественно-политического движения (ОПД), обеспечивающего режиму массовую социальную поддержку, придающего видимость легитимности.

